Мінская багаслоўская семінарыя
Саюза евангельскіх хрысціян баптыстаў у Рэспубліцы Беларусь

Тэалагічны інстытут хрысціян веры евангельскай (г. Мінск)

# Евангельская Царква Беларусі: гісторыя і сучаснасць

## Выпуск 6

(да 470-годдзя Рэфармацыі ў Беларусі)

Зборнік матэрыялаў

Мінск
Саюз евангельскіх хрысціян баптыстаў у Рэспубліцы Беларусь
2024

УДК [279.123+274/278]–9(476)(082)
ББК 86.373(4Беи)
Е13

**Укладальнікі:**
А.І. Бокун, А.У. Унучак, Ю.А. Бачышча

**Рэдакцыйная калегія:**
П.І. Асененка, Ю.А. Бачышча, А.І. Бокун, Л.І. Міховіч, С.С. Паднюк, А.У. Унучак, Р.В. Шапялевіч

**Евангельская Царква Беларусі: гісторыя і сучаснасць.** Выпуск 6 (да
Е13 470-годдзя Рэфармацыі ў Беларусі) : зборнік матэрыялаў / уклад.: А. І. Бокун, А. У. Унучак, Ю.А. Бачышча. — Мінск: Саюз ЕХБ у Рэспубліцы Беларусь, 2024. — 432 с.: іл.
ISBN 978-985-7033-42-3

Выданне прысвечана 470-годдзю Рэфармацыі ў Беларусі. У зборнік матэрыялаў увайшлі артыкулы, тэматыка якіх закранае як гісторыю Евангельскай Царквы Беларусі і беларускай культуры ў XVI і пачатку XVII стст., так і беларускія евагельскія прабуджэнні канца XIX і XX стст. Увазе чытача прадстаўлена даследаванне выдавецкай дзейнасці Брэсцкай друкарні XVI ст., аналіз творчасці Беняша Буднага і аналіз прававога становішча пратэстантаў ВКЛ у XVIII ст. Кніга таксама змяшчае інфармацыю пра развіццё евангельскага руху на Гомельшчыне і Віцебшчыне ў канцы XIX – пачатку XX ст. і многае іншае.

Для тых, хто цікавіцца гісторыяй Евангельскай Царквы Беларусі і канфесійнай гісторыяй нашай краіны.

**УДК [279.123+274/278]–9(476)(082)**
**ББК 86.373(4Беи)**

**ISBN 978-985-7033-42-3**

© Бокун А. І., Унучак А. У., Бачышча Ю. А., укладанне, 2024
© Афармленне. Саюз евангельскіх хрысціян баптыстаў у Рэспубліцы Беларусь, 2024

*Андрусь Унучак.* Служэньне пастара Лукаша Дзекуць-Малея ў адлюстраваньні часопіса "Маяк" (1920-я – 1930-я гг.) ........................................ 258
*Юрась Бачышча.* Членская кніга Царквы ХВЭ ў вёсцы Студзёнкі Нясьвіскага раёну як гістарычная крыніца ... 270
*Лізавета Ваеўчык.* Мікалай Карэтка і Сяргей Бацук — прадстаўнікі евангельскай музычнай культуры Берасцейшчыны ХХ ст. ........................................ 281
*Таццяна Лісоўская.* Фармаванне адносін савецкіх уладаў да евангельска-баптыскага руху Беларусі (1917-1929 гг.) ........................................ 297
*Уладзімір Русецкі.* Уплыў грамадска-палітычных падзей 1920-х – пачатку 1990-х гг. на міграцыйныя працэсы і колькасць членаў у цэрквах ХВЕ Вілейскага раёна ........................................ 314
*Павел Асененка.* Структура і кіраванне беларускімі цэрквамі ЕХБ у 1944-1991 гг. ........................................ 333
*Таццяна Касатая.* Эпісталярная форма супрацiву вернікаў царквы ЕХБ у БССР (1940-я – 1980-я гг.) ...... 340
*Павел Калоша.* Нарыс гісторыі царквы ХВЕ "Святло Евангелля" пасёлка Дружны Пухавіцкага раёна .......... 375
*Сяргей Паднюк.* Асаблівасці Бібліі на беларускай мове ў перакладзе Антонія Бокуна ........................................ 392
*Марына Слесарава, Юрась Гецэвіч, Наталля Анофранка, Анастасія Драгун, Андрусь Бакуновіч.* Пратэстанцкая спадчына Беларусі ў аўдыягідзе KrokApp ........................................ 401
*Філіп Нікіцін.* Важнае выданьне для дасьледчыкаў і шырокай аўдыторыі ........................................ 409
Заключнае слова........................................ 414

Марыя СЛЕСАРАВА, Юрась ГЕЦЭВІЧ,
Наталля АНОФРАНКА, Анастасія ДРАГУН,
Андрусь БАКУНОВІЧ

# Пратэстанцкая спадчына Беларусі ў аўдыягідзе KrokApp

Духоўная спадчына Пратэстанцкай Царквы ў Беларусі мае доўгую гісторыю і адыгрывае значную ролю ў рэлігійным і культурным жыцці краіны. Пратэстантызм зрабіў вялікі ўклад у развіццё талерантнасці і застаецца важнай часткай рэлігійнага жыцця беларусаў. Традыцыі пратэстантаў ахопліваюць мноства аспектаў, якія ўкараніліся ў культуры і гісторыі хрысціянства ў розных рэгіёнах свету. Евангельскія цэрквы валодаюць непаўторным наборам богаслужбовых традыцый, якія ўключаюць хрышчэнні, пропаведзі, малітвы, а спевы (ад класічных харальных матываў да сучаснай хрысціянскай рок-музыкі і госпэла) ствараюць асаблівую атмасферу і надаюць прыгажосць пратэстанцкім набажэнствам. Багатая архітэктурная і літаратурная спадчына пратэстантызму аказвае значны ўплыў на культурнае жыццё Беларусі.

Захаванне духоўнай і матэрыяльнай спадчыны беларускага пратэстантызму немагчыма без шэрагу мер, накіраваных на прасоўванне рэлігійных і культурных традыцый. Яны ўключаюць у сябе і адукацыйныя праграмы, накіраваныя на тое, каб навучыць маладое пакаленне шанаваць і паважаць рэлігійныя традыцыі і гісторыю краіны. Гэтаму садзейнічае арганізацыя рэлігійных і культурных мерапрыемстваў, фестываляў і выстаў. А захаванне і аднаўленне гістарычных помнікаў, такіх як зборы, кірхі, малітоўныя дамы і іншыя рэлігійныя збудаванні, з’яўляецца адным з найважнейшых крокаў у фарміраванні гістарычнай свядомасці індывіда.

Прышчапленню павагі да гісторыка-культурных каштоўнасцяў спрыяе рэлігійны турызм. Гэта форма турызму, накіраваная на наведванне месцаў, звязаных з рэлігійнымі або духоўнымі практыкамі, якія маюць духоўнае значэнне. Мэтай такога турызму з'яўляецца не толькі адпачынак, але і духоўнае ўзбагачэнне, пошук духоўнага натхнення, спакою і ўнутранага пераўтварэння. А вельмі зручным інструментам, які значна палепшыць турыстычны вопыт, могуць быць інтэрактыўныя аўдыягіды. Яны прапануюць вандроўнікам зручны і інфарматыўны спосаб знаёмства з мясцовасцю, якую тыя наведваюць, і славутасцямі, якія іх цікавяць.

Інтэрактыўныя аўдыягіды могуць быць вельмі эфектыўнымі ў турызме, паколькі яны прадстаўляюць карыстальнікам магчымасць атрымаць інфармацыю аб мясцовасці, славутасцях і гісторыі ў зручным фармаце. Акрамя таго, яны могуць даць турыстам магчымасць пагрузіцца ў гісторыю і культуру духоўнага месца больш поўна і глыбока.

Прымяненне інтэрактыўных аўдыягідаў у рэлігійным турызме спрыяе:

- паглыбленню ў гісторыю: аўдыягіды прыводзяць інфармацыю аб духоўных традыцыях, гістарычных фактах і важных асобах, звязаных з канкрэтнай мясцовасцю;
- індывідуальнасці: для многіх вандроўнікаў важна захоўваць свой асабісты маршрут і тэмп знаёмства з рэлігійнымі аб'ектамі. Інтэрактыўныя аўдыягіды дазваляюць турыстам атрымліваць інфармацыю без неабходнасці камунікацыі з гідам або іншымі наведвальнікамі і з той хуткасцю, якую яны абіраюць самі;
- зніжэнню грашовых выдаткаў: турысты могуць азнаёміцца з гісторыяй і культурай мясцовасці ў зручны для іх час без прыцягнення прафесійнага экскурсавода і неабходнасці падстройвацца пад агульную экскурсію.

Прыкладам інтэрактыўных аўдыягідаў для прадстаўлення беларускіх славутасцяў і знакамітых мясцін з'яўляецца IT-платформа KrokApp. Яна змяшчае персанальныя аўдыягіды для

Android[1] і iOS[2] прыкладанняў, а таксама web-версію на афіцыйным сайце[3], дзе размешчана асноўная інфармацыя аб праграме і апошніх дададзеных аб'ектах. Аўдыягід прапаноўвае знаёмства з гісторыка-культурнымі аб'ектамі ў выглядзе кароткіх тэкстава-візуальных аглядаў розных месцаў (малюнак 1). KrokApp распрацаваны лабараторыяй распазнавання і сінтэзу маўлення АІПІ НАН Беларусі[4]. Прыкладанне дазваляе атрымаць інфармацыю пра славутасці, а таксама прапануе практычныя парады і карысныя паведамленні падчас перамяшчэння па мясцовасці.

Сярод турыстычных кропак, прадстаўленых у KrokApp, можна знайсці розныя віды славутасцяў: аб'екты духоўнай спадчыны, абарончыя збудаванні, гістарычныя будынкі, помнікі гістарычным асобам, тапаграфічныя аб'екты, прыродныя аб'екты і іншае. Дзякуючы GPS-тэхналогіям, вандроўнік можа адзначыць колькасць свабоднага часу, выдаткаванага на экскурсію, і пабудаваць маршрут з улікам вызначанага часу. Кожная кропка суправаджаецца аўдыя- і тэкставай інфармацыяй, што спрыяе засваенню важных і цікавых фактаў, якія не губляюцца ў вялізных паведамленнях.

---

1 Электронны рэсурс: https://play.google.com/store/apps/details?id=by.ssrlab.krokapp&pli=1 KrokApp // GooglePlay.

2 Электронны рэсурс: https://apps.apple.com/us/app/krokapp/id1498624840 KrokApp // AppStore.

3 Электронны рэсурс: http://krokapp.by/ KrokApp — персанальны аўдыягід па гарадах Беларусі.

4 Электронны рэсурс: https://ssrlab.by/ Лабараторыя распазнавання і сінтэзу маўлення.




**Мал. 1. Інтэрфейс Android-версіі KrokApp**

Складанне апісанняў славутасцяў праходзіць у некалькі этапаў. Лінгвісты рыхтуюць тэкставае паведамленне аб аб'екце, якое затым праходзіць праверку ў Інстытуце гісторыі НАН Беларусі. На наступным этапе ажыццяўляецца яго пераклад і агучванне. Да інфармацыі аб аб'екце дадаюцца іх фатаграфіі і GPS-каардынаты. Уся інфармацыя захоўваецца ў кансолі праграмы. Гэта важны інструмент у праграмаванні, які выкарыстоўваецца для ўзаемадзеяння з праграмай. У кансолі ажыццяўляецца ўвод і вывад аўдыя- і тэкставай інфармацыі, адсочванне працы аўдыягіда, кіраванне файламі і многае іншае. Кансоль прадстаўляе разнастайныя магчымасці, такія як налады, тэставанне функцый, пошук і выпраўленне памылак (малюнак 2).

На сённяшні дзень KrokApp уключае знакавыя мясціны ў больш чым 85 гарадах Беларусі, што складае больш за 490 гісторыка-культурных аб'ектаў. Адметнасць інтэрактыўнага аўдыягіда заключаецца ў шырокім асвятленні духоўнай спадчыны нашай краіны. KrokApp змяшчае 173 рэлігійныя славутасці, сярод якіх 125 — каталіцкія касцёлы і праваслаўныя цэрквы, 11 — манастыры і кляштары, 7 — сінагогі і 12 — пратэстанцкія цэрквы. Сярод іх *Кірха святога Антонія Падуанскага ў Брэсце*, *Гомельская царква ЕХБ*, *Гомельская*

*царква ХВЕ "Благадаць", Царква ЕХБ "Надзея" у Сянно, Царква ХВЕ "Збаўленне" у Баранавічах, Царква ХВЕ "Благадаць" (Тэалагічны інстытут ХВЕ) у Мінску, Лютаранская кірха ў Гродне, Царква ЕХБ "Вулька" ў Брэсце, Царква ЕХБ "Адраджэнне" і Царква ЕХБ "Збаўленне" ў Брэсце, Кобрынская Цэнтральная царква ЕХБ.* Аўдыягід прадстаўляе пацверджанае афіцыйнымі крыніцамі апісанне кожнай з пералічаных славутасцяў у тэкставым фармаце ці аўдыяфайле са змяшчэннем яе выявы. Карыстальнік можа даведацца пра асноўныя факты гісторыі аб'екта, знайсці яго дакладны адрас з GPS-каардынатамі і адсачыць яго на карце (малюнак 3).




**Мал. 2. Кансоль аўдыягіда KrokApp**

Падрабязная інфармацыя пра праект даступная на афіцыйным сайце, дзе можна знайсці спасылкі на мабільныя і вэб-версіі, паглядзець інтэрактыўную карту, пазнаёміцца з папулярнымі або апошнімі данымі аб славутасці, а таксама ўбачыць статыстыку спамповак. Аўдыягід прызначаны для збору, захавання і папулярызацыі культурнай спадчыны Беларусі. Ён дае карыстальніку хуткі і зручны доступ да інфармацыі пра вялікую колькасць населеных пунктаў Беларусі. Маленькія гарады і рэлігійныя супольнасці атрымліваюць магчымасць папулярызаваць свае славутасці, развіваць турыстычную плынь і прыцягнуць увагу да тых аб'ектаў, якія маюць патрэбу ў

аднаўленні і дадатковым фінансаванні. Таксама KrokApp акумулюе працу спецыялістаў розных сфер — праграмістаў, філолагаў, гідаў, гісторыкаў і г. д. Варта адзначыць, што аўдыягід не скасоўвае працу прафесійнага гіда, але надае ёй якасна іншы ўзровень: экскурсавод можа складаць платныя і бясплатныя маршруты, якія карыстальнікі могуць прайсці самастойна і аглядаць абраную славутасць неабмежаваную колькасць часу без арыентацыі на экскурсійную групу.




**Мал. 3. Апісанне царквы "Благадаць" і Тэалагічнага інстытута ХВЕ ў мабільнай версіі KrokApp**

Да пераваг інтэрактыўнага аўдыягіда KrokApp[5] можна аднесці:

- персаналізаваны вопыт: турысты могуць выбіраць тыя месцы, якія іх цікавяць, а таксама праслухоўваць іх апісанні ў зручны час;

[5] Зяноўка Я.С. Гісторыка-культурная спадчына Беларусі з асабістымі аўдыягідамі «Krokam» // Нацыянальныя культуры ў міжкультурнай камунікацыі. Мінск, 2021. С. 202-210.

- гнуткасць: аўдыягід дазваляе турыстам ісці ў сваім тэмпе і выбіраць аб'екты, якія іх цікавяць;
- шматмоўнасць: аўдыягід прадстаўлены на беларускай, англійскай і рускай мовах, што зручна для замежных турыстаў;
- інтэрактыўнасць: аўдыягід прапануе прачытаць ці праслухаць інфармацыю, адзначыць сваё месцазнаходжанне і пракласці маршрут дзякуючы ўбудаваным функцыям Google GPS і Google Maps.

Неабходна адзначыць, што распрацоўшчыкі вядуць бесперапынную працу над прыкладаннем. Яна ўключае ў сябе даданне тэкставых нататак і аўдыязапісаў для новых турыстычных кропак, дапрацоўку матэрыялаў па ўжо існуючых аб'ектах (пераклад і агучванне апісанняў на розныя мовы, выпраўленне багаў і памылак, знойдзеных у аўдыягідзе). Акрамя таго, лабараторыя распазнавання і сінтэзу маўлення АІПІ НАН Беларусі супрацоўнічае з разнастайнымі арганізацыямі, музеямі, бібліятэкамі для стварэння новых праектаў папулярызацыі гісторыка-культурных каштоўнасцяў. Некаторыя з распрацовак размешчаны ў сховішчы Krokam[6]. Гэта платформа для інтэрактыўных аўдыягідаў і навігатараў, якая прапануе інфармацыю аб культурных, гістарычных і прыродных аб'ектах Беларусі. Яна дае магчымасць пазнаёміцца з аб'ектамі як віртуальна, так і можа быць добрым памочнікам на мясцовасці, дзе яны размешчаны[7]. У будучыні плануецца павялічыць колькасць турыстычных кропак па ўсіх гарадах Беларусі і дадаць магчымасць для экскурсаводаў, краязнаўцаў, гісторыкаў і простых карыстальнікаў уносіць сваю інфармацыю ў KrokApp. Таксама кантэнт прыкладання будзе перакладзены на іншыя мовы (напрыклад, польскую, украінскую, літоўскую, чэшскую і кітайскую) з мэтай прыцягнення замежных турыстаў і прасоўвання беларускай культуры па-за межамі краіны. Распрацоўшчыкі таксама збіраюць зваротную сувязь ад карыстальнікаў для паляпшэння якасці прыкладання і пашырэння яго магчымасцяў.

---

[6] Электронны рэсурс: https://krokam.com/ KROKAM па тутэйшым краі і ваколіцах з вашым асабістым аўдыягідам.

[7] Слесарава М.М. Аўдыягіды Krokam у індустрыі беларускага турызму // Перспективы развития туризма в современных условиях: мировые тенденции и региональные контексты. Минск, 2023. С. 454-463.

## SUMMARY

*Maria Slesarava, Yuras Hetsevich,*
*Natalia Anofranka, Anastasia Drahun,*
*Andrus Bakunovich*

**The Protestant heritage of Belarus in the KrokApp audio guide**

This article depicts the role of spiritual tourism as a means of respect for historical and cultural values and religious traditions. The article considers the KrokApp IT platform as an example of interactive audio guides for presenting Belarusian religious landmarks and significant places. It is realized on three platforms: Android, iOS, and Web. The application contains brief text-visual reviews of various places and provides information about the sights. KrokApp also allows the user to build routes based on the allotted time and get information about various sights.